Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(73), 2012

## История

*УДК 9 930.1(477)«18/19»*

# Украінская гістарычная думка ў пачатку эпохі нацыянальнага адраджэння (другая палова XVIII – 20-я гады XIX ст.)

Г.А. Аляксейчанка

У артыкуле разглядаюцца канкрэтна-гістарычныя ўмовы, асноўныя напрамкі і змест развіцця ўкраінскай гістарычнай думкі ў кантэксце эпохі нацыянальнага адраджэння.
**Ключавыя словы**: гісторыя, гістарычная думка, Украіна, нацыянальнае адраджэнне, асветніцтва, палітыка, нацыянальная эліта.

The article shows special historical conditions, basic directions and the development of Ukrainian historical thought during the period of national renaissance.
**Keywords:** history, historical thought, Ukraine, national renaissance, enlightenment, politics, national elite.

Ва ўмовах сучаснай метадалагічнай пераарыентацыі гістарычнай навукі, асваення здабыткаў сусветных навуковых школ і падрыхтоўкі новых генерацый даследчыкаў вялікая роля належыць звароту да ўласнай гістарыяграфічнай спадчыны. Крытычнае асваенне асноўных этапаў развіцця гістарычнай навукі, яе метадалагічнага інструментарыя, канцэптуальных пабудоў, даследчыцкай лабараторыі класікаў гістарычнай навукі дазваляюць перадаць яе лепшыя здабыткі наступным пакаленням гісторыкаў [1, с. 430–431], [2, с. 63].

Развіцце навуковай гістарычнай думкі Украіны звязана з уплывамі еўрапейскіх асветніцкіх ідэй і прынцыпаў грамадскага і навуковага жыцця. Спецыфіка гэтага працэсу на Украіне была вызначана тым, што ён адбываўся ў “пераломную” эпоху, калі на памежжы XVIII–XIX стст., следам за ліквідацыяй царскім урадам аўтаноміі Левабярэжнай Украіны і руйнаваннем Запарожскай Сечы, ва ўмовах сістэмнай інкарпарацыі ўкраінскага грамадства ў агульнаімперскую структуру, пачынаецца ўкраінскі нацыянальны рух. Ён разгортваўся ў форме нацыянальна-культурнага адраджэння, хаця напачатку меў выразны грамадска-палітычны вектар, што мела пад сабой аб’ектыўныя падставы.

Справа ў тым, што афіцыйны ўрадавы курс Пецярбурга не абмяжоўваўся перабудовай адміністрацыйнага ладу і органаў кіравання: пачыналася ўніфікацыя і нівеліроўка грамадска-саслоўнай структуры, прававых норм, сістэмы асветы і г. д.

Адказам на гэтыя імперскія захады стала арганізаваная апазіцыя былой казацка-старшынскай эліты і шляхты. Даводзячы легітымнасць “правоў і вольнасцей” Маларосіі, яе аўтаномнага статусу, што была замацавана вядомымі расійска-ўкраінскімі дагаворамі сярэдзіны XVII ст., патрыёты-маларосы выступалі за аднаўленне гістарычна склаўшагася status guo. У літаратуры гэтыя дзеячы атрымалі назву “аўтанамісты”. Іх першым арганізаваным выступленнем стала вядомая “маларасійская фронда”, калі скліканыя для выбараў дэпутатаў у кацярынінскую Укладальную камісію (1767–1768 гг.) прадстаўнікі ад шляхты, казацтва і мяшчанства ў сваіх наказах абраным дэпутатам салідарна выказаліся за “пацвярджэнне старынных правоў і вольнасцей” Маларосіі і насуперак жорсткаму адміністрацыйнаму націску падчас выбараў аддавалі перавагу кандыдатам, здольным абараняць інтарэсы свайго краю. Патрыятычны настрой і даволі высокая згуртаванасць адрознівалі маларасійскіх дэпутатаў на працягу ўсёй дзейнасці Укладальнай камісіі [4, с. 324–326].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Паварот да палітыкі «лисьего хвоста и волчьего рта», які быў вызначаны Кацярынай II для Левабярэжнай Украіны ў 70–80-я гады XVIII ст., прадугледжваў паслядоўны раскол мясцовай эліты, яе частковую бюракратызацыю, актыўнае выкарыстанне яе службова-кар'ерных амбіцый, імкнення да хуткай набілітацыі і інш. Гэты курс часткова павялічыў кола лаяльных да прэстола прадстаўнікоў маларасійскага "новага дваранства", што мела сваім вынікам спад апазіцыйных настрояў сярод мясцовай эліты. Аднак устойлівыя ў Маларосіі "умоначертания прежних времен" [5, с. 167], якіх апасалася імператрыца, канчаткова не зніклі: апазіцыйнасць праяўлялася ў больш латэнтных і замаскіраваных формах. На пачатку 90-х гг. XVIII ст. у адказ на паварот Геральдыі да больш жорсткіх умоў і патрабаванняў да набілітацыі казацка-старшынскіх слаёў у Левабярэжнай Украіне разгарнуўся актыўны і скаардынаваны рух за "дакументалізацыю" правоў украінскай эліты на атрыманне расійскага дваранства. Быў арганізаваны мэтанакіраваны пошук гістарычных звестак і дадзеных у розных архівах і сховішчах. Гэты зварот палітыкаў да гісторыі меў выразны прагматычны характар, але ен таксама абуджаў інтарэс да сваёй гістарычнай мінуўшчыны.

Новы ўздым аўтанамісцкага руху назіраўся пасля смерці Кацярыны II, калі пэўныя праявы маларасійскіх "сімпатый" Паўла I, а потым ліберальна-рэфарматарскі курс палітыкі Аляксандра I стваралі даволі спрыяльныя ўмовы для актывізацыі "маларасійскай партыі" А.А. Безбародкі ў вышэйшых эшалонах улады. У гэты час лабіраваўся шэраг аўтанамісцкіх праектаў (А. Безбародкі – І. Гудовіча, М. Міклашэўскага, Я. Лабанава-Растоўскага, Д. Трашчынскага і інш.) і назіраліся актыўныя захады па іх рэалізацыі [6, с. 348–349].

У падтрымку гэтай лініі на Наддняпроўшчыне з'явіўся вядомы цыкл запісак і трактатаў у абарону "маларасійскіх правоў і вольнасцей", напісаных у пачатку XIX ст. лідэрамі ўкраінскіх аўтанамістаў Р. Марковічам, Ф. Туманскім, А. Чэпам, В. Палетыкам, Т. Калінскім і інш. [7, с. 76–77]. Гэтыя дакументы, як нам уяўляецца, прызначаліся для інфармавання службовых асоб мясцовага і вышэйшага ўрадавага ўзроўня.

Адначасова азначаныя запіскі і трактаты мелі даволі шырокі выхад на гісторыю Маласоросіі ад XV–XVI стст. і маглі стаць эфектыўным сродкам папулярызацыі сярод украінскага "новага дваранства" аўтанамісцкай дактрыны, а таксама важнейшых падзей і фактаў з гісторыі Гетманшчыны і Войска Запарожскага. З аналагічнай мэтай была напісана і знакамітая "История русов", якая большасцю спецыялістаў у жанравым плане вызначаецца як гісторыка-палітычны памфлет. Аднак надзвычай высокая папулярнасць гэтага твора ў 20–40-х гг. XIX ст., на наш погляд, была абумоўлена не толькі яго ідэйна-палітычным зместам, але і спробай цэльнай і паслядоўнай рэпрэзентацыі гісторыі ўкраінскага народа, якая была запатрабавана часам і людзьмі.

У гэтым сэнсе спробы прадставіць актыўны паварот тагачаснай украінскай эліты да гісторыі выключна як нейкі "пабочны прадукт" палітычных захадаў аўтанамістаў ці набілітацыйных працэдур нам уяўляюцца занадта катэгарычнымі і "лінейнымі". Больш глыбокую ацэнку гэтаму "рэнесансу" гістарычнай свядомасці дваранскай эліты Украіны даў класік украінскай гістарыяграфіі Д.І. Дарашэнка, які разглядаў яго як з'яву, "характэрную для тых эпох у жыцці зняволеных нацый, калі яны пад пагрозаю знішчэння гістарычнага ўкладу іх жыцця … мацней адчуваюць вагу ўласнай гістарычнай традыцыі і … намагаюцца акурат у гэтай мінуўшчыне знайсці маральную апору, прававую аснову і сілы для абароны сваіх грамадскіх і нацыянальных ідэалаў" [4, с. 11].

Апошнія даследаванні ўкраінскіх вучоных Н. Якавенка, Л. Довгай, П. Саса, А. Струкевіча і інш. дазваляюць рабіць больш шырокія сістэмна-акрэсленыя абагульненні, якія пераконваюць у тым, што ў навукова-асветніцкім асяроддзі Украіны канца XVII – пачатку XVIII ст. усталяваўся своеасаблівы культ гісторыі Бацькаўшчыны, а таксама адмысловы этас служэння ёй, які праяўляўся як маральна-грамадзянскі абавязак [8, с. 88–89]. Ад пачатку XVIII ст. высокаадукаваны стан "вайсковых канцэлярыстаў", які, па вызначэнню гісторыка А. Прыцака, "пачынае працэс секулярызацыі... навукі", адначасова ўзяў на сябе і адказную "місію дакументалізіраваць факт за фактам гісторыю краіны" [9, с. 63]. У гэтым асяроддзі ўзнікла і развівалася да другой паловы XVIII ст. казацка-старшынскае летапісанне, аснову якога складалі тры гісторыка-хранікальных помніка: летапісы Самавідца, Г. Грабянкі і С. Вя-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лічкі. Яны неслі на сабе выразны адбітак літаратуры барока, але адначасова вызначаліся рацыянальным стылем і логікай апавядання, даволі грунтоўнай і арыгінальнай дакументальнай базай [10, с. 90–94]. Цэнтральным тэматычным ядром казацка-старшынскіх летапісаў з'яўлялася славутая эпоха Хмельніччыны з дэталевай хронікай асноўных падзей і галоўных фактаў, вызначэннем асобных перыядаў, яркімі і змястоўнымі ацэнкамі гістарычных асоб.

Практыка казацка-старшынскага летапісання ў Левабярэжнай Украіне мела сваім галоўным вынікам істотнае ўмацаванне і пашырэнне традыцый гістарычнай хранiстыкі. Апошнія здабыткі ўкраінскай рэгіянальнай археаграфіі канчаткова пераконваць у тым, што летапіс Грабянкі і яго позняя кампіляцыя – "Краткое описание Малороссии" – сталі асновай для шэрагу мясцовых гістарычных хронік ("Летописец Краткий", "Нежинская летопись" і інш.), якія рэгулярна дапаўняліся звесткамі канца XVIII ст. і нават пачатку XIX ст. [11, с. 348–382]. Працяглае захаванне гэтай знешне "архаічнай" практыкі ў адукаваным асяроддзі ўкраінскага Надднепроўя – праява жывога (хаця пераважна аматарскага) інтарэсу да мінуўшчыны і клопату аб яе збераджэнні ў гістарычнай памяці пакаленняў.

З сярэдзіны XVIII ст. новая генерацыя інтэлектуалаў-асветнікаў – Р. Покас, А. Дзівовіч, А. Шафонскі, С. Лукомскі, П. Сіманоўскі і інш. – здолела выратаваць з небыцця частку казацка-старшынскіх летапісаў, апрацавала і падрыхтавала іх для далейшага навуковага асваення. Яно разгарнулася ўжо на зыходзе XVIII ст. намаганнямі пецярбургскага "гуртка маларосаў" пад патранажам вядомага саноўніка і мецэната А.А. Безбародкі. Сябры гэтага гуртка вывучылі даступныя тэксты вядомых украінскіх летапісаў і пасля зверкі розных варыянтаў падрыхтавалі да выдання найбольш значныя. У выніку з'явіліся першыя апублікаваныя помнікі казацка-старшынскага летапісання: "Краткая летопись Малой России" (выдадзена ў 1777 г. В. Рубан пры ўдзеле А.А. Безбародкі) і "Летописец Малыя России", вядомы як летапіс Грабянкі (выдадзены ў 1793 г. Ф. Туманскім). Практыка т. зв. "сталічных" выданняў асобных гістарычных крыніц па Украіне атрымала свой працяг у пачатку XIX ст. Намаганнямі Я. Балхавіцінава, Я. Марковіча, М. Берлінскага, В. Анастасевіча і інш. у навуковы зварот былі ўведзены каштоўныя падборкі матэрыялаў і нават асобныя дакументальныя рарытэты. Сярод іх можна вызначыць найбольш змястоўныя ў навукова-інфармацыйным плане публікацыі крыніц па гісторыі Украіны ў часопісах "Российский магазин" Ф.В. Туманскага, "Улей" (1811–1812 гг.) В.Г. Анастасевіча і інш. [12, с. 185].

Адначасова сярод прыгаданых раней маладых аўтанамістаў разгортваецца праца па сістэматызацыі і папаўненню т. зв. сямейных (радавых) архіваў, мэтанакіраванаму пошуку гістарычных дакументаў, рукапісаў, рарытэтных рэчаў і г. д. [13, с. 158–159]. Варта падкрэсліць, што адсутнасць мясцовых навуковых цэнтраў, прафесійных кадраў і адпаведнага вопыту рабіла вырашэнне гэтай задачы надзвычай складанай. Заўважым дадаткова, што ад часоў Паўночнай вайны 1700–1721 гг. і на працягу ўсяго XVIII ст. багацейшыя архіўныя фонды Гетманшчыны і Запарожскай Сечы большай часткай былі знішчаны альбо вывезены з Украіны і раскіданы (у асноўным бессістэмна) па розных ведамасных архівах Расійскай імперыі [14, с. 3–4]. Характэрным у гэтым плане з'яўляецца лес Батурынскага архіва і бібліятэкі гетмана Мазепы, які сучасныя даследчыкі параўноўваюць са знакамітым «янтарным пакоем» [15, с. 175–180]. Неўпрадкаванай заставалася і большасць мясцовых архіваў. Каардынатарамі гэтага руху аматараў даўніны былі нашчадкі вядомых казацка-старшынскіх радоў В. Палетыка, А. Чэпа, В. Лукашэвіч, Я. Марковіч і інш. Маладыя інтэлектуалы-асветнікі не абмяжоўваліся "антыкварнымі заняткамі", яны жадалі быць "носьбітамі і творцамі гістарычных ведаў" [1, с. 158].

Азначаны "гістарыяграфічны рэнесанс" як феномен грамадскага жыцця тагачаснай Украіны і сёння вымагае свайго глыбокага асэнсавання. Пэўны арганізацыйны імпульс гэтай справе дала дзейнасць у Надднепроўскай Украіне экспедыцый і камісій, створаных Акадэміяй навук Расіі ў сярэдзіне 70-х – 80-я гг. XVIII ст.[16, с. 33–34, 38–41]. У працу на ніве гісторыі ў розных формах і на розных узроўнях уключыліся дзесяткі руплівых даследчыкаў. Маштабы іх дзейнасці, як сведчаць навейшыя археаграфічныя распрацоўкі А.Б. Каваленкі [гл. 17–19], былі больш значнымі, чым гэта ўяўлялася спецыялістам раней. У выніку на працягу параўнальна кароткага тэрміну з'явіўся вялікі цыкл гісторыка-рэгіянальных апісанняў,

пабудаваных па асветніцкіх канонах “народаапісання” (геаграфія, прыродна-кліматычныя ўмовы, дэмаграфія, этнаграфічныя асаблівасці, культура і г. д.). Сярод іх вылучаюцца сваей грунтоўнай гісторыка-дакументальнай базай працы М. Антаноўскага, В. Рубана, М. Яноўскага, М. Берлінскага, М. Маркава, А. Леўшына, Г. Успенскага. У сучаснай украінскай гістарыяграфіі з імі звязваецца фарміраванне “... двух важных прагрэсіўных тэндэнцый – пашырэнне крыніцавай базы і пачатак актыўнага асэнсавання і абагульнення вузлавых момантаў айчыннай гісторыі...” [13, с. 226–227].

Актыўнае вывучэнне мінуўшчыны даволі хутка выйшла за межы гістарычнага агляду “родных ваколіц”. Сучасны даследчык В.В. Краўчанка ў гэтай сувязі адзначае, што на памежжы XVIII–XIX ст. урэшце стала відавочным: “Некалькі пакаленняў украінскага дваранства выхоўваліся, не маючы перад сабой ніводнай публікацыі з гісторыі сваёй Бацькаўшчыны, акрамя “Краткого описания Малой России”, створанага ў 30-х гг. XVIII ст. і выдадзенага ў зменeным выглядзе ў 1777 г.” [20, с. 369].

У гэтых умовах адной з галоўных задач патрыётаў-асветнікаў стала напісанне абагульняючай гісторыі Украіны-Маларосіі. Сімвалічнай праявай грамадскага значэння гэтай справы стала прызначэнне ў 1781 годзе Ф. Туманскага, вядомага вучонага і асветніка, гістарыёграфам “па выбару усея Маларосіі” [9, с. 65]. Па падліках спецыялістаў за стварэнне такой абагульняючай гісторыі браліся каля дзесяці ўкраінскіх асветнікаў-энтузіястаў і знаўцаў айчыннай гісторыі. Сярод іх толькі часткова рэалізавалі свой намер Я. Марковіч, М. Антаноўскі, М. Яноўскі, Я. Ламікоўскі. Шэраг завершаных гісторый застаўся ў рукапісах, далейшы лес якіх нам не вядомы. Сярод іх – пяцітомная “История Малой России” А.І. Мартоса, змястоўныя працы А. Безбародкі, Ф. Туманскага, М. Берлінскага, А. Худорбы, А. Марковіча і інш.

Аднак руплівая і мэтанакіраваная дзейнасць украінскіх патрыётаў-асветнікаў мела бясспрэчныя навуковыя здабыткі. З'явіўся шырокі цыкл гісторыка-рэгіянальных апісанняў Наддняпроўскай Украіны, пленна развівалася гістарычная журналістыка. У 1798 годзе ўбачыла свет “Записка о Малой России» Я. Марковіча – скарочаны вырыянт рыхтаваўшайся аўтарам фундаментальнай гісторыі, з'явілася славутая “История русов”, якая стала першым вопытам цэльнай і паслядоўнай рэпрэзентацыі палітычнай гісторыі Украіны [13, с. 231]. Урэшце выхад у 1822 годзе першага выдання чатырохтомнай “Истории Малой России” Д. Бантыш-Каменскага засведчыў, што “ўкраінская гістарыяграфія канчаткова выйшла за межы летапіснай, кампілятыўнай гістарычнай літаратуры і падышла да таго рубяжу, з якога пачыналася гістарычная навука” [20, с. 370].

Такім чынам, можна цалкам пагадзіцца з Зянонам Когутам у тым, што разглядаемая намі эпоха аказала “значны ўплыў на зберажэнне гістарычнай свядомасці і фарміраванне новай украінскай гістарыяграфіі”. Разам з тым гістарычная думка стала не толькі сродкам захавання, абароны і ідэалагічнай артыкуляцыі нацыянальна-палітычных традыцый і культуры ўкраінцаў, яна выконвала фактарную ролю ў фарміраванні іх нацыянальнай ідэнтычнасці, вызначала перспектывы і змест наступнага этапа ўкраінскага нацыянальнага адраджэння [1, с. 159].

**Літаратура**

1. Калакура, Я. Українська історіографія / Я. Калакура. – Київ : Генеза, 2004. – 494 с.

2. Стельмах, С.П. Теоретични новації у вітчизняній історіографії другої половини XIX століття / С.П. Стельмах // Навукові записки НУ «Киево-Могилянська академія». – Т. 18. – Историчні науки. – К., 2000. – С. 63–69.

3. Дорошенко, Д.И. Нарис історії Украіни / Д.І. Дрошенко. – Львів : Світ, 1991. – 576 с.

4. Ефименко, А.Я. История украинского народа / А.Я. Ефименко. – Киев : Либідь, 1990. – 512 с.

5. Грушевский, М.С. Очерк истории украинского народа / М.С. Грушевский. – Киев : Либідь, 1991. – 397 с.

6. Потульницкий, В.А. Україна і всесвітна історія. Історіософія світовой та українськой історії XVII–XX століть / В.А. Потульницкий. – Київ : Либідь, 2002. – 478 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

7. Магочи, П. Українське національне відродження. Нова аналітична структура / П. Магочи // Українські історичний журнал. – 1991. – № 3. – С. 102–106.

8. Аляксейчанка, Г.А. Гістарычная свядомасць украінскай грамадскай эліты ў пачатку эпохі нацыянальнага адраджэння (другая палова XVIII – 20-я гг. XIX ст.) / Г.А. Аляксейчанка // Восточные славяне: историческая и духовная общность : материалы науч.-практ. конф., Гомель, 15–16 апреля 2008 г. / Гомельск. ун-т, о-во Кирилла Туровского ; ред. колл. : В.И. Коваль [и др.]. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2008. – С. 87–90.

9. Прицак, О. Доба військових канцеляристів / О. Прицак // Київська старовина. – 1993. – № 4. – С. 62–66.

10. Ковальский, Н.П. Украинские летописи / Н.П. Ковальский, Ю.А. Мыцык // Вопросы истории. – 1985. – № 10. – С. 81–94.

11. Бовгиря, А. Українські історичні хроніки пізньої доби (друга половина XVIII – початок XIX століття) / А. Бовгиря // Наукові записки інститута української археографії та джерелознавства ім. М.С. Грушевского. – Т. 10. – Збірнік прац молодих вчених та аспірантів. – Київ, 2005. – С. 347–384.

12. Аляксейчанка, Г.А. Асветніцкі этап у развіцці ўкраінскай гістарыяграфіі: людзі, ідэі, здабыткі / Г.А. Аляксейчанка // Зборнік навуковых прац гістарычнага факультэта ГДУ імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – С. 183–187.

13. Бойко, О.Д. Історія України / О.Д. Бойко. – 3-те вид. – Київ : Академвидав, 2008. – 688 с.

14. Сохань, П. Повернути писемні скарби / П. Сохань, Л. Лозенко // Київська старовина. – 1993. – № 2. – С. 3–6.

15. Таирова-Яковлева, Т. Батуринский архив Ивана Мазепы / Т. Таирова-Яковлева // Батуринська старовина. Збірнік наукових прац, присвячений 300-літтю Батуринськой трагедіі. – Київ : Видавництво імені Олени Телиги, 2008. – С. 175–180.

16. Горленко, В.Ф. Становление украинской этнографии конца XVIII – первой половины XIX ст. / В.Ф. Горленко. – К. : Наукова думка, 1988. – 214 с.

17. «Сокращенное историческое описание Черниговской губернии...» 1787 г. / публ. О.Б. Коваленка // Сіверянський літопіс. – 1995. – № 2. – С. 82–95.

18. Коваленко, О. Неопублікована праця Андрія Пригари «Особое или топографическое описание города губернского Новгород-Северского» (1786 г.) // Сіверянський літопіс. – 1999. – № 4. – С. 160–165.

19. Коваленко, О. Невідома праця кінца XVIII ст. з історіі Стародуба / О. Коваленко, І. Петреченко // Сіверянський літопіс. – 2000. – № 3. – С. 160–166.

20. Кравченко, В.В. Нариси українськой історіографіі епохі національного відродження / В.В. Кравченко. – Харків : Вид. Харк. ун-та, 1996. – 376 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 14.03.12

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ